**Рыхлова В.А.,**
*аспірантка кафедры беларускай мовы і літаратуры*

# СЕЛЬСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ЯК АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

У адпаведнасці са зменамі, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве, сельская бібліятэка перажывае часы пошуку свайго месца ў сферы новых духоўных запатрабаванняў карыстальнікаў. Цяпер, калі кожная бібліятэка ўжо набыла свае права на самавызначэнне ў гаспадарчай і культурнай дзейнасці, з'явілася магчымасць акрэсліць найбольш аптымальныя напрамкі развіцця сельскіх бібліятэк. Разглядаючы гэтае пытанне, нельга не адзначыць негатыўныя моманты, якія ўплываюць на работу сельскіх бібліятэк. Як і большасць устаноў культуры, сельскія бібліятэкі знаходзяцца ў даволі складаным матэрыяльным становішчы. Яшчэ адзін адмоўны фактар — зніжэнне агульнага ідэйна-эстэтычнага ўзроўню насельніцтва: страчаны былыя ідэалы, а зноў набытыя не заўсёды аказваюцца станоўчымі. Як вядома, асноўныя функцыі бібліятэкі ўяўляюць захаванне агульначалавечых каштоўнасцей і перадачу духоўнай спадчыны з пакалення ў пакаленне. У гэтым плане сельская бібліятэка мае вялікі, яшчэ не выкарыстаны поўнасцю станоўчы патэнцыял. Што таму спрыяе? Па-першае, абрады і традыцыі, фальклор і мова з'яўляюцца для вясковага жыхара натуральным асяроддзем. Гэта не новыя павевы, што прыйшлі на хвалі адраджэння ў жыццё гарадскога насельніцтва, а жывыя вытокі нацыянальнай культуры, якія патрабуюць беражлівых адносін і захавання ў сваім першародным выглядзе. Па-другое, вясковае асяроддзе больш падрыхтавана да ўспрымання нацыянальнай культурнай спадчыны.

Выконваючы функцыю захавання нацыянальнай памяці народа, бібліятэка працуе ў двух напрамках:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1) пошук, зберажэнне і адраджэнне гістарычнай і культурнай спадчыны;

2) падрыхтоўка насельніцтва да яе ўспрымання. Наколькі размова ідзе не проста пра зварот да вытокаў нацыянальнай культуры, а пра яе развіццё, сельская бібліятэка з'яўляецца важнейшым суб'ектам такога развіцця. Яна разам з сям'ёй і сельскай супольнасцю зберагае звёны нацыянальнай культуры. Разнастайнасць сувязей сельскай бібліятэкі з жыццём вёскі не дазваляе разглядаць яе ізалявана ад іншых сацыяльных інстытутаў. Аднак сельская супольнасць мае свае асаблівасці: тут у большай ступені захаваўся нацыянальны менталітэт, не страцілі свайго значэння традыцыйныя маральныя каштоўнасці. Вядома, размова не ідзе пра нейкага архаічнага беларуса, які жыве, не ведаючы, што такое сучасныя сродкі інфармацыі. Але ўсё ж народныя традыцыі і погляды ў вясковым асяроддзі маюць больш глыбокія карані. Яшчэ адна асаблівасць: чытачы сельскай бібліятэкі з'яўляюцца не толькі ўспрымальнікамі нацыянальнай культурнай спадчыны, але яе захавальнікамі і носьбітамі. Многія з іх ведаюць шмат фальклорных твораў, абрадаў, народных гульняў. Яны самі з'яўляюцца крыніцамі абнаўлення нацыянальнай культуры.

Беларускі народ у сваёй мове, міфалогіі, вуснапаэтычнай творчасці, літаратуры і мастацтве выказаў і пакінуў у спадчыну нашчадкам сваё разуменне каштоўнага, разумнага і прыгожага. У беларускай мове, як і ў іншых мовах народаў свету, адлюстравана адзіная, самабытная і непаўторная карціна бачання свету. Мова як сродак адлюстравання самабытнага светапогляду ўвасобілася ў вуснай народнай творчасці, а потым у помніках беларускай пісьменнасці і творах сучаснай беларускай літаратуры.Захаванне гэтай часткі нацыянальнай культуры (фарміраванне кніжнага фонду) поўнасцю адпавядае першаму з напрамкаў у дзейнасці бібліятэк па захаванні гісторыка-культурных каштоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцей.

Значныя магчымасці для сельскіх бібліятэк закладзены і ў развіцці краязнаўства. Сельская бібліятэка як культурны цэнтр павінна збіраць і захоўваць статыстычныя, дэмаграфічныя, этнаграфічныя звесткі, фальклорны матэрыял, матэрыял аб спецыфіцы земляробства ў сваёй мясцовасці, матэрыялы аб народных рамёствах, звесткі па тапаніміцы. Важным момантам у краязнаўстве з'яўляецца работа бібліятэкі з мясцовым друкам як адной з асноўных крыніц вывучэння краю. Усё гэта павінна рабіцца з добрым уяўленнем аб ролі бібліяграфіі ў развіцці краязнаўства. На аснове збораў краязнаўчых звестак пры многіх сельскіх бібліятэках працуюць краязнаўчыя клубы па агульнай зацікаўленасці навучэнцаў сярэдніх школ і моладзі. Сябры такіх клубаў збіраюць звесткі пра гісторыю сваёй вёскі, пра славутых землякоў, пісьменнікаў і паэтаў-ураджэнцаў дадзенай мясцовасці, пра народных умельцаў і рамёствы на тэрыторыі свайго сельскага Савета. Даследаванні па ажыццяўленні праграмы "Спадчына" выявілі, што пры многіх сельскіх бібліятэках створаны краязнаўчыя музеі і калекцыі. У Магілёўскай вобласці была праведзена работа па вывучэнкі мясцовага дыялекту, зроблены альбомы з запісамі народных абрадавых песень, прыказак, прымавак. Краязнаўчыя матэрыялы, што былі сабраны многімі бібліятэкамі, выкарыстаны для напісання гісторыка-дакументальных хронік раёнаў пад назвай "Памяць".

Не маючы сродкаў для таго, каб авалодаць вялікай колькасцю крыніц інфармацыі, сельскія бібліятэкі маюць магчымасць стаць інфармацыйнымі цэнтрамі па пытаннях краязнаўства і нацыянальнай культуры. Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, кожная сельская бібліятэка сёння валодае даведачнай літаратурай па гісторыі і культуры Беларусі, звесткамі пра розныя віды мастацтва. Такія матэрыялы цікавяць навучэнцаў сярэдніх школ, студэнтаў-завочнікаў, настаўнікаў, вясковую інтэлігенцыю,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аматараў гісторыі Беларусі. Нават на побытавым узроўні сельская бібліятэка можа прапанаваць сваім карыстальнікам шмат карысных краязнаўчых звестак. У сваёй практычнай дзейнасці сельскія жыхары маюць патрэбу ў інфармацыі аб нацыянальных асаблівасцях жыллёвых забудоў, аб ганчарным майстэрстве, ткацтве, лозапляценні. Усе гэтыя звесткі з'яўляюцца інфармацыяй аб матэрыяльнай культуры беларусаў. Для спецыялістаў сельскай гаспадаркі можа быць карыснай краязнаўчая інфармацыя аб асаблівасцях земляробства і жывёлагадоўлі ў сваёй мясцовасці, аб традыцыйна вырошчваемых тут сельскагаспадарчых культурах.

Як культурны цэнтр, крыніца інфармацыі сельская бібліятэка прыцягвае да сябе карыстальнікаў з рознымі інтарэсамі і запатрабаваннямі. Адначасова яна з'яўляецца і месцам правядзення вольнага часу. Па многіх аспектах сельская бібліятэка адпавядае бібліятэцы сямейнага чытання. У наш час, адметны дэфіцытам стасункаў, роля бібліятэк у арганізацыі ўмоў для іх актывізацыі сярод карыстальнікаў павышаецца.

У сельскай бібліятэцы ў арганізацыі міжасабовых зносін ёсць свае перавагі. Чытач сельскай бібліятэкі больш падрыхтаваны для размовы. Ён часцей звяртаецца за парадай і дзеліцца сваімі ўражаннямі з бібліятэкарам. У такіх умовах лепш праходзіць працэс узаемадзеяння чытача і бібліятэкара.

Гэта як мага лепш адпавядае прынцыпу парытэту ў рабоце з чытачамі, паглыбленню міжасабовых зносін. Нярэдка чытачы сельскіх бібліятэк самі з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі розных формаў міжасабовых зносін. Яны прымаюць удзел у фальклорных вечарах, у народных святах. Спецыфічнасць такіх формаў міжасабовых зносін у тым, што яны — частка жыцця селяніна. Ён памятае пра гэтыя святы, так ці інакш адзначае іх. Але заўсёды ёсць патрэба ў прафесійным арганізатары такіх свят. Ім можа быць і работнік іншай установы — сельскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

клуба ці Дома культуры. Але ж у падборы спецыяльнай літаратуры для такіх мерапрыемстваў (фальклорных песень, гульняў) неабходны ўдзел бібліятэкара. Тым больш, што заўсёды ёсць магчымасць для выкарыстання краязнаўчага матэрыялу, сабранага сельскай бібліятэкай. Такім чынам адбываюцца не толькі зберажэнне культурнай спадчыны, але і яе развіццё ў сучасных умовах.

Арганізуючы вольны час, адпачынак дарослых і дзяцей, сельская бібліятэка забяспечвае пашырэнне свайго ўплыву адначасова ў розных звёнах адной сістэмы: у бібліятэцы, школе, сям'і. Калі сувязь "бібліятэка — сям'я" ў большай ступені арганізацыя сумеснага правядзення вольнага часу бацькоў і дзяцей, то сувязь "бібліятэка — школа" носіць больш асветны і выхаваўчы характар.

Ролю сістэмы "бібліятэка — сям'я — школа" ў сацыялізацыі асобы сельскага школьніка цяжка перабольшыць. Клопат аб маральным здароўі маладога пакалення, стварэнне ўмоў для развіцця інтэлекту, дапамога ў выбары і набыцці прафесіі, у развіцці самапазнання — гэта поле дзейнасці і для сям'і, і для школы, і для бібліятэкі. Нягледзячы на тое, што ўжываць тэрмін "кіраванне чытаннем" праблематычна, педагагічны момант у рабоце са школьным чытачом выяўляецца ўсё ж больш, чым ва ўзаемадзеянні з іншымі чытацкімі аўдыторыямі.

Не абмяжоўваючы творчага развіцця асобы, бібліятэка павінна ў адносінах да маладога сельскага чытача выконваць свае асветніцкія, выхаваўчыя, адукацыйныя функцыі. Сельскія бібліятэкі здольныя накіраваць сваю дзейнасць на выхаванне ў дзяцей і юнакоў культуры чытання, дапамагчы ў фарміраванні цікавасці да лепшай гуманістычнай, высокаінтэлектуальнай літаратуры, падрыхтаваць да ўспрымання культурнай нацыянальнай спадчыны. Немалую ролю ў гэтых працэсах адыгрывае выхаванне цікавасці да нацыянальнай літаратуры. Выконваючы работу па зберажэнні і захаванні культурнай і літаратурнай спадчыны, фарміраванні фонду беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкай літаратуры, бібліятэка падрыхтоўвае да ўспрымання гэтай спадчыны. Спазнаючы свет, сябе ў гэтым свеце, дзіця, падлетак, юнак павінны асэнсоўваць сябе як асобу, якая знаходзіцца на трывалым падмурку, што стварылі мінулыя пакаленні. Толькі ў такім выпадку можна стаць сапраўдным грамадзянінам, гарманічнай асобай, якая паважае сваю нацыянальную культуру, ганарыцца ёю і з павагай ставіцца да культуры іншых народаў.

Існуе непарыўная сувязь у выхаванні павагі, любові да нацыянальнай культуры праз розную літаратуру, праз кнігу. Менавіта ў аснове выхаваўча-асветніцкай дзейнасці бібліятэк ляжыць работа з кнігай, раскрыццё перад юнымі чытачамі скарбаў роднай літаратуры. Асабліва важна раскрыць яе значнасць у кантэксце сусветнай літаратуры. Гэта дапаможа чытачам лепш усвядоміць спецыфіку адлюстравання рэчаіснасці ў мастацкім слове, зразумець значнасць агульначалавечых каштоўнасцей праз успрыманне і параўнанне нацыянальнай літаратуры і літаратуры народаў свету, абудзіць цікавасць школьнікаў да мастацкай літаратуры ўвогуле.

Вядучая роля ў кіраўніцтве чытаннем беларускай літаратуры адводзіцца настаўніку-славесніку, хаця на розных стадыях працэсу чытання роля школы і бібліятэкі ў такім кіраўніцтве розная. Вывучэнне літаратуры ў школе і самастойнае чытанне ў бібліятэцы — гэта два розныя віды чытацкай дзейнасці. Іх цесная ўзаемасувязь з'яўляецца неабходнай умовай развіцця вучня сярэдняй школы як чытача мастацкай літаратуры. Пакуль што гэтая сувязь бессістэмная, эпізадычная. Бібліятэка прымае ўдзел у святкаванні школай юбілеяў пісьменнікаў, у вывучэнні творчасці малавядомых беларускіх аўтараў. І гэтым, па сутнасці, абмяжоўваецца яе сувязь са школай. Асновай для сумеснай работы школы і бібліятэкі павінны з'явіцца наступныя напрамкі:

1) інфармацыйная дзейнасць — вывучэнне і задавальненне інфармацыйных запатрабаванняў вучняў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настаўнікаў у галіне чытання беларускай мастацкай літаратуры;

2) арганізацыйная работа — сумеснае правядзенне розных формаў міжасабовых зносін, уключаючы членаў сем'яў, бацькоў;

3) метадычная работа — агульнае планаванне работы з кнігай у школе і бібліятэцы, узаемаўплыў настаўніка-славесніка і бібліятэкара на павышэнне прафесійнага ўзроўню і педагагічнага майстэрства ў кіраўніцтве чытаннем дзяцей, удасканаленне бібліятэчна-бібліяграфічнай пісьменнасці (для настаўніка-славесніка), улік дасягненняў педагогікі дзіцячага чытання і дзіцячай літаратуры для бібліятэкара;

4) сумесная выхаваўча-адукацыйная дзейнасць бібліятэкара і настаўніка-славесніка — экскурсіі ў бібліятэку па тэме, якая вывучаецца ў класе, заключныя ўрокі, што праводзяцца ў бібліятэцы ля кніжных паліц, арганізацыя авансаванага чытання, калі бібліятэка рэкамендуе школьнікам кнігі перад тым, як пачнецца іх вывучэнне па праграме.

Такім бачыцца будучае супрацоўніцтва сельскай школы і бібліятэкі ў галіне падрыхтоўкі маладога сельскага чытача да ўспрымання нацыянальнай культурнай спадчыны.

Падсумаваўшы ўсё сказанае вышэй, адзначым, што сельская бібліятэка з'яўляецца цэнтрам нацыянальнай культуры, нацыянальнай памяці народа, месцам правядзення вольнага часу, месцам міжасобасных зносін, духоўным фактарам фарміравання моладзі. Улічваючы ўсе асаблівасці і спецыфіку сельскага жыцця, яна арганічна ўваходзіць у грамадскія і культурныя рэаліі сучаснай вёскі. Ажыццяўленне Беларускім фондам культуры праграмы “Спадчына” паказала, што сельскія бібліятэкі ў цэлым добра падрыхтаваны для захавання і распаўсюджвання культурнай спадчыны. Яны павінны выкарыстаць усе магчымасці для правядзення культурна-асветніцкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасці як унутры школы, так і сярод насельніцтва вёскі ўвогуле.

**Капырына А.А.,**
*аспірантка кафедры*
*бібліяграфіі і дакументазнаўства*

## ФАКТАРНЫ АНАЛІЗ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ДАВЕДАЧНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАГА АБСЛУГОЎВАННЯ

Вывучэнне эфектыўнасці даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання (ДБАБ) выявіла неабходнасць ва ўдасканаленні бібліяграфічнай дзейнасці. Так, сярод надзённых праблем бібліяграфазнаўства, якія патрабуюць паглыбленай распрацоўкі, на першы план даследчыкі вылучаюць тыя, што маюць вырашальнае значэнне пры ўдасканаленні практычнай дзейнасці. Сённяшнюю сітуацыю, у якой функцыяніруе айчынная сістэма бібліятэк, наогул можна ахарактарызаваць як вельмі супярэчлівую. Тут адбываюцца ўваходжанне ў побыт відэапрадукцыі, камп'ютэраў, электронных сродкаў перадачы інфармацыі, падаражанне састаўляючых бібліятэчнай дзейнасці, якое апярэджвае тэмпы іх фінансавання і інш. Не дэталізуючы праблематыку сённяшняга стану бібліятэчнай справы, тым не менш магчыма ўпэўнена вызначыць ядро, вакол якога крышталізуюцца падобныя супярэчнасці. Гэта эфектыўнасць інфармацыйнага абслугоўвання насельніцтва.

Намаганні бібліятэчнай сістэмы выйсці на якасна новы ўзровень работы сутыкаюцца з праблемай абгрунтаванай аб'ектыўнай ацэнкі эфектыўнасці і якасці бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк. Таму тэарэтыка-метадычныя праблемы эфектыўнасці ДБАБ займаюць адно з важных месцаў у шэрагу фундаментальных бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ